# Сучасная беларуская літаратурная мова

Зацверджана
Міністэрствам адукацыі
Рэспублікі Беларусь
у якасці падручніка для студэнтаў
устаноў вышэйшай адукацыі
па філалагічных спецыяльнасцях

Пад рэдакцыяй Д.В. Дзятко

Мінск
«Вышэйшая школа»
2024

УДК 811.161.3(075.8)
ББК 81.2Беи-923
С91

А ў т а р ы: *Д.В. Дзятко*, доктар філалагічных навук, прафесар; *Н.П. Лобань*, кандыдат філалагічных навук, дацэнт; *С.С. Мароз*, кандыдат філалагічных навук, дацэнт; *П.А. Міхайлаў*, кандыдат філалагічных навук, дацэнт; *Н.М. Нямковіч*, кандыдат філалагічных навук, дацэнт; *Н.А. Радзіваноўская*, кандыдат філалагічных навук, дацэнт; *М.С. Ржавуцкая*, кандыдат філалагічных навук, дацэнт; *В.І. Самахавец*, магістр філалагічных навук; *Т.Я. Старасценка*, кандыдат філалагічных навук, дацэнт; *В.В. Урбан*, кандыдат філалагічных навук, дацэнт; *Н.У. Чайка*, доктар філалагічных навук, прафесар; *С.У. Шахоўская*, кандыдат філалагічных навук, дацэнт

Р э ц э н з е н т ы: кафедра беларускага мовазнаўства Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (загадчык кафедры доктар філалагічных навук, прафесар *М.Р. Прыгодзіч*); дацэнт кафедры рускай мовы і культуры маўлення ўстановы адукацыі “Ваенная акадэмія Рэспублікі Беларусь” кандыдат філалагічных навук, дацэнт *С.І. Фацеева*

**Сучасная** беларуская літаратурная мова : падручнік / Д. В. Дзятко
С91 [і інш.] ; пад рэд. Д. В. Дзятко. – Мінск : Вышэйшая школа, 2024. − 591 с. : іл.
ISBN 978-985-06-3602-7.

Падручнік створаны з улікам сучасных тэндэнцый у беларускай лінгвістыцы. У ім поўна і рознабакова падаецца сістэматызаваны тэарэтычны курс сучаснай беларускай літаратурнай мовы. Усе ўключаныя ў падручнік тэмы максімальна структураваныя, што дазваляе выкарыстоўваць кнігу і як даведачнае выданне. Важнае месца адводзіцца аналізу моўных адзінак.

Для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі па філалагічных спецыяльнасцях. Будзе карысны магістрантам, аспірантам, настаўнікам і выкладчыкам.

**УДК 811.161.3(075.8)**
**ББК 81.2Беи-923**

*Усе правы на дадзенае выданне абаронены. Узнаўленне ўсёй кнігі ці любой яе часткі не можа быць ажыццёўлена без дазволу выдавецтва.*

**ISBN 978-985-06-3602-7**

© Афармленне. УП «Выдавецтва “Вышэйшая школа”», 2024

# ПРАДМОВА

Сучасная лінгвістыка з'яўляеццца складанай сістэмай, якая аб'ядноўвае мноства навук, што толькі ў сваёй сукупнасці даюць дастаткова поўныя веды пра ўсе бакі чалавечай мовы.

Беларуская мова валодае афіцыйным статусам дзяржаўнай мовы ў Рэспубліцы Беларусь. Яна выкарыстоўваецца ў паўсядзённым жыцці, у сферы справаводства, адукацыі, літаратуры, палітыкі і мае выключнае значэнне для захавання нацыянальнай культуры.

Дысцыпліна "Сучасная беларуская літаратурная мова" лічыцца асноўнай сярод курсаў, якія вывучаюцца на беларусазнаўчых спецыяльнасцях філалагічных факультэтаў установ вышэйшай адукацыі нашай краіны.

Падручнік створаны з улікам дасягненняў сучаснага мовазнаўства, адрасаваны будучым спецыялістам у галіне філалогіі і адпавядае ўсім патрабаванням Дзяржаўнага адукацыйнага стандарту і вучэбнай праграмы.

Аўтары паставілі перад сабой задачу максімальна поўна апісаць актуальны стан і асаблівасці функцыянавання беларускай мовы. Канцэпцыя і структура кнігі апрабаваны на працягу многіх гадоў у практыцы выкладання беларускай мовы на філалагічным факультэце Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка, пры падрыхтоўцы энцыклапедыі для школьнікаў і студэнтаў "Беларуская мова" (2022). Аўтарамі ўлічаны вопыт стварэння папярэдніх пакаленняў падручнікаў па беларускай мове, напісаных выкладчыкамі кафедры беларускага мовазнаўства БДПУ ("Беларуская мова" пад рэд. М.С. Яўневіча (1991), "Сучасная беларуская літаратурная мова: Уводзіны. Лексікалогія. Фразеалогія. Лексікаграфія. Фразеаграфія. Фанетыка. Арфаэпія. Графіка. Арфаграфія" (1993), "Сучасная беларуская літаратурная мова. Марфалогія" пад рэд. М.С. Яўневіча (1997), "Сінтаксіс сучаснай беларускай мовы" М.С. Яўневіча і П.У. Сцяцко (2006) і інш.), а таксама вучэбных дапаможнікаў, падрыхтаваных калектывамі вучоных іншых універсітэтаў Беларусі (Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна, Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава, Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны, Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы, Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.А. Куляшова, Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І.П. Шамякіна).

Разам з тым, кніга істотна адрозніваецца ад іншых падобных выданняў.

У аснову апісання беларускай мовы пакладзены прынцып сістэмнасці. Усе ўключаныя ў падручнік тэмы максімальна структураваныя. Сістэмна-структурны падыход не толькі дазваляе прадставіць мову як адзінства разнастайных фактаў і з'яў, але і дае магчымасць прасачыць адносіны, якія існуюць паміж элементамі розных моўных узроўняў, выявіць прычыны гэтых адносін і прагназаваць шляхі далейшага развіцця[1].

З улікам сучаснага ўзроўню лінгвістычных ведаў істотна абноўлены і пашыраны змест усіх раздзелаў навукі пра беларускую мову (асабліва гэта датычыць фаналогіі, арфаграфіі, марфемалогіі, дэрываталогіі, лексікаграфіі).

Упершыню ў якасці асобных раздзелаў падручніка вылучаны тэмы, прысвечаныя вывучэнню анаматалогіі, парэміялогіі, афарыстыкі.

Важнае месца ў падручніку адводзіцца аналізу моўных адзінак, які не толькі дапамагае іх усвядомленай інтэрпрэтацыі, але і знаёміць з методыкай першаснай навукова-даследчай работы. У выніку такога падыходу вывучэнне дысцыпліны пераходзіць на ўзровень самастойнага навуковага асэнсавання моўных фактаў.

У кнізе шырока выкарыстоўваюцца схемы і табліцы, якія дазваляюць у кампактнай візуалізаванай форме праілюстраваць усю разнастайнасць адносін паміж моўнымі адзінкамі, формамі і катэгорыямі.

Выклад матэрыялу пачынаецца з разгляду агульных пытанняў беларускага мовазнаўства, звязаных з сутнасцю мовы, заканамернасцямі яе развіцця і функцыянавання. Далей падаюцца звесткі па фаналогіі, арфаэпіі, арфаграфіі, марфемалогіі, дэрываталогіі, лексікалогіі, анаматалогіі, марфалогіі, сінтаксісе, пунктуацыі, лексікаграфіі. Пры асвятленні тэорыі паслядоўна захоўваецца прынцып традыцыйнага і сучаснага вытлумачэння моўных з'яў. Усім раздзелам падручніка ўласцівы комплексны падыход да моўных адзінак (фанемы, марфемы, лексемы і г.д.), што дазваляе прасачыць іх узаемасувязь, паказаць нарматыўнасць моўных з'яў. Пры гэтым найперш улічваецца задача не толькі апісання сістэмы мовы, але і ацэнкі моўных з'яў з пункту гледжання правільнасці іх выкарыстання.

Паколькі сучаснае мовазнаўства з'яўляецца вынікам працяглага і дастаткова супярэчлівага развіцця лінгвістычнай думкі, многія яго праблемы могуць быць зразумелыя толькі ў гістарычным аспекце. Таму да моўных з'яў, якія складана абгрунтаваць з пункту гледжання сінхраніі, даецца кароткі гістарычны каментарый, што садзейнічае асэнсаванню працэсу развіцця мовы, тлумачэнню ўнутранай логікі і сістэмнай арганізацыі моўных фактаў.

---

[1]Прагрэс навукі заўсёды суправаджаецца фарміраваннем і ўдасканальваннем тэрміналагічнай сістэмы. Разам з тым, у мовазнаўстве пашыраны цэлы шэраг тэрмінаў, якія недакладна або няпоўна перадаюць змест тэрмінаваных паняццяў, аднак працягваюць выкарыстоўвацца "па традыцыі". Прынцып сістэмнасці патрабуе ад аўтараў захавання паслядоўнасці пры ўжыванні спецыяльных найменняў. Па гэтай прычыне ў падручніку перавага аддаецца сучасным тэрмінам, утвораным па традыцыйных мадэлях: фаналогія (фанетыка), дэрываталогія (словаўтварэнне), марфемалогія (марфеміка), анаматалогія (анамастыка) і інш.

Як вядома, не ўсе праблемы, што вывучаюцца ў курсе "Сучасная беларуская літаратурная мова", маюць адназначныя рашэнні. Жанр кнігі вымусіў аўтараў аддаваць перавагу тым падыходам, якія валодаюць большай вытлумачальнай сілай, адпавядаюць айчыннай лінгвістычнай традыцыі і маюць агульнапрынятыя навуковыя падставы. У той жа час ва ўмовах сучаснага інфармацыйнага грамадства важна было паказаць і альтэрнатыўныя падыходы да разумення і вывучэння моўных фактаў. Выклад розных пазіцый павінен палегчыць задачу разумення сучасных навуковых канцэпцый і садзейнічаць выпрацоўцы крытычнасці пры ацэнцы існуючых поглядаў на тыя або іншыя праблемы, дапамагчы ўзмацніць і развіць навыкі лінгвістычнага мыслення.

Тэарэтычныя высновы суправаджаюцца дастатковай колькасцю моўных фактаў, узятых найчасцей з твораў мастацкай літаратуры.

Ілюстрацыйны матэрыял у падручніку прадстаўлены найбольш выразнымі прыкладамі, дастатковымі для пацвярджэння тэарэтычных палажэнняў. Крыніцай ілюстрацый паслужылі тэксты пераважна мастацкай літаратуры (Якуба Коласа, Янкі Купалы, М. Багдановіча, Кузьмы Чорнага, У. Караткевіча, В. Быкава, Янкі Брыля, В. Адамчыка, Д. Бічэль-Загнетавай, Г. Далідовіча і інш.).

Абмежаваны аб'ём падручніка не дазваляе прэтэндаваць на вычарпальнае асвятленне ўсіх праблем беларускай літаратурнай мовы, паколькі гэта задача спецыяльных навуковых выданняў – манаграфій і граматык. Аднак узровень выкладу многіх тэм у падручніку зробіць яго карысным не толькі для студэнтаў, але і для магістрантаў, аспірантаў, выкладчыкаў.

Аўтарская праца была размеркавана наступным чынам: *Дзятко Д.В.*: раздзел I (1.4), раздзел V (5.4), раздзел VI (6.11 – у суаўтарстве з Лобань Н.П.), раздзел XI, раздзел XIII (тэмы 10–14 – у суаўтарстве з Самахавец В.І.), раздзел XVI; *Лобань Н.П.*: раздзел VI (6.10, 6.11 – у суаўтарстве з Дзятко Д.В., 6.12–6.15), раздзел XIII (тэма 9); *Мароз С.С.*: раздзел XIV (тэмы 3 (14.3.12–14.3.14), 4–6), раздзел XV; *Міхайлаў П.А.*: раздзел I (1.1–1.3, 1.5–1.9); *Нямковіч Н.М.*: раздзелы VIII–X; *Радзіваноўская Н.А.*: раздзел XIII (тэмы 1, 2, 4); *Ржавуцкая М.С.*: раздзел XIV (тэмы 1, 2, 3 (14.3.1–14.3.11)); *Самахавец В.І.*: раздзел XIII (тэмы 10–14 – у суаўтарстве з Дзятко Д.В.); *Старасценка Т.Я.*: раздзел VI (6.1–6.9), раздзел XIII (тэмы 3, 5–8); *Урбан В.В.*: раздзел IV, раздзел V (5.1–5.3, 5.5), раздзел XII; *Чайка Н.У.*: раздзел XIII (тэма 15); *Шахоўская С.У.*: раздзелы II, III, VII.

Аўтары шчыра ўдзячныя калегам, якія рэцэнзавалі ўвесь падручнік або асобныя яго часткі на розных этапах працы над кнігай: калектыву мовазнаўцаў УА "Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава" і Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, асабіста Г.А. Арцямёнку, З.І. Бадзевіч, В.Л. Варановічу, А.В. Кавалёвай, Д.Л. Крымоўскаму, Н.М. Нямковіч, Д.Д. Паўлаўцу, М.Р. Прыгодзічу, В.В. Урбан, С.І. Фацеевай.

# РАЗДЗЕЛ І. БЕЛАРУСКАЯ МОВА ЯК ГРАМАДСКАЯ З'ЯВА І АБ'ЕКТ ВЫВУЧЭННЯ

## 1.1. Сучасная беларуская літаратурная мова як вучэбная дысцыпліна

Грамадства не можа існаваць без перадачы інфармацыі. Для забеспячэння зносін паміж людзьмі, для абмену думкамі выкарыстоўваецца чалавечая мова. Яна дазваляе найбольш рацыянальным спосабам атрымліваць і перадаваць любую інфармацыю.

Па розных даных, агульная колькасць моў на Зямлі складае ад 2,5 да 5 тыс. Акрамя таго, налічваецца ад 6 да 8 тыс. дыялектаў.

> Прыкладна палова моў прыпадае на 8 краін: Інданезію, Мексіку, Бразілію, Камерун, Індыю, Кітай, ЗША і Расію.

Беларуская мова ўваходзіць у сотню найбольш развітых моў свету. Яна з'яўляецца дзяржаўнай мовай Рэспублікі Беларусь. Паводле перапісу насельніцтва 2019 г. яе назвалі роднай 54% жыхароў Беларусі, у тым ліку 61,2% беларусаў.

Беларуская мова з'яўляецца прадметам вывучэння шэрага лінгвістычных дысцыплін, што даследуюць яе гісторыю, сучасны стан, дыялектны склад, стылістычную сістэму і інш.

Курс "Сучасная беларуская літаратурная мова" змяшчае навуковую характарыстыку беларускай літаратурнай мовы на сучасным этапе яе развіцця і займае цэнтральнае месца сярод усіх лінгвістычных дысцыплін, якія выкладаюцца на беларусазнаўчых спецыяльнасцях філалагічных факультэтаў устаноў вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь.

**Аб'ект** вывучэння дысцыпліны – сучасная беларуская літаратурная мова.

**Мэта** дысцыпліны – выпрацаваць навуковы погляд на сучасную беларускую літаратурную мову і дасканала авалодаць яе сістэмай.

Курс "Сучасная беларуская літаратурная мова" цесна звязаны з такімі лінгвістычнымі дысцыплінамі, як "Беларускае мовазнаўства", "Гісторыя беларускай мовы", "Беларуская дыялекталогія", "Стылістыка беларускай мовы", "Методыка выкладання беларускай мовы", "Параўнальная граматыка ўсходнеславянскіх моў" і інш.

## 1.2. Структура дысцыпліны "Сучасная беларуская літаратурная мова"

Мова з'яўляецца **сістэмай** (гр. systēma 'цэлае, складзенае з частак, злучэнне'). Яна характарызуецца структурнай шматузроўневасцю, якая

праяўляецца ў тым, што кожны з элементаў сістэмы таксама складаецца з элементаў і ўяўляе сабой асобную падсістэму. Напрыклад, у лексічную сістэму мовы ўваходзяць падсістэмы сінонімаў, амонімаў, антонімаў, у граматычную сістэму – падсістэмы членаў сказаў, граматычна-семантычных класаў слоў (часцін мовы) і інш.

Мова мае іерархічную будову: больш буйныя адзінкі мовы складаюцца з адзінак больш дробных, а тыя, у сваю чаргу, − з яшчэ больш дробных. Напрыклад, сказы складаюцца са слоў, словы – з марфем, марфемы – з фанем.

**Узроўні мовы** – падсістэмы мовы, якія складаюцца з аднародных адзінак, што знаходзяцца ў іерархічных адносінах з іншымі адзінкамі.

Вылучаюць:

- фаналагічны ўзровень;
- марфемны ўзровень;
- лексічны ўзровень;
- марфалагічны ўзровень;
- сінтаксічны ўзровень і інш.

У выніку вывучэння розных моўных узроўняў акрэсліліся асноўныя раздзелы лінгвістыкі (табл. 1):

- фаналогія;
- арфаэпія;
- графіка;
- арфаграфія;
- лексікалогія;
- фразеалогія;
- парэміялогія;
- афарыстыка;
- марфемалогія;
- дэрываталогія;
- марфалогія;
- сінтаксіс;
- пунктуацыя;
- лексікаграфія.

*Табліца 1*

**Раздзелы навукі пра мову**

| Раздзел лінгвістыкі | Аб'ект вывучэння | Даследчыкі |
|---|---|---|
| Фаналогія | Гукавыя адзінкі мовы і маўлення, склад, націск і інтанацыя | М.В. Бірыла, В.Р. Бурлыка, І.Р. Бурлыка, Н.Т. Вайтовіч, П. Векслер, Л.Ц. Выгонная, А.А. Крывіцкі, А.І. Падлужны, П.В. Садоўскі, С.Г. Хвясько, В.М. Чэкман, П.Я. Юргелевіч, Ф.М. Янкоўскі і інш. |
| Арфаэпія | Нормы літаратурнай мовы, якія ахопліваюць правілы вымаўлення гукаў і іх спалучэнняў | М.В. Бірыла, Л.Ц. Выгонная, А.А. Каляда, А.І. Падлужны, П.В. Садоўскі, В.М. Чэкман, Э.Р. Якушаў, Ф.М. Янкоўскі і інш. |
| Графіка | Пісьмовыя сродкі беларускай мовы (графемы, знакі прыпынку, знак націску, розныя прыёмы скарачэння слоў, шрыфтавыя вылучэнні і інш., суадносіны паміж літарамі і гукамі, абрысы літар, знакаў і г.д.) | А.М. Булыка, У.М. Дубоўка, Я.М. Камароўскі, Я.Ю. Лёсік, А.І. Яновіч і інш. |

| **Раздзел лінгвістыкі** | **Аб’ект вывучэння** | **Даследчыкі** |
|---|---|---|
| Арфаграфія | Правілы, якімі рэгулюецца аднастайная перадача вуснай мовы на пісьме | М.В. Бірыла, І.А. Гапоненка, А.І. Жураўскі, В.І. Іўчанкаў, А.А. Каўрус, У.І. Куліковіч, Л.П. Кунцэвіч, І.Я. Лепешаў, А.А. Лукашанец, А.Я. Міхневіч, А.І. Падлужны, Ф.А. Піскуноў, П.В. Садоўскі, Д.Ф. Саўка, П.У. Сцяцко і інш. |
| Лексікалогія | Слоўнікавы склад мовы, крытэрыі сістэматызацыі лексікі, паходжанне слоў, вызначэнне сферы і асаблівасцей ужывання слова ў маўленні і інш. | М.В. Абабурка, У.В. Анічэнка, А.М. Бардовіч, А.Я. Баханькоў, М.В. Бірыла, М.Г. Булахаў, М.С. Васілеўскі, Г.Ф. Вештарт, Л.Ц. Выгонная, А.П. Груцо, А.І. Жураўскі, А.А. Лукашанец, Г.М. Мезенка, А.Я. Міхневіч, Б.А. Плотнікаў, М.Р. Прыгодзіч, В.І. Рагаўцоў, І.С. Роўда, А.А. Станкевіч, В.Д. Старычонак, А.Я. Супрун, П.У. Сцяцко, Л.М. Шакун, П.П. Шуба, В.В. Шур, Ф.М. Янкоўскі і інш. |
| Анаматалогія | Уласныя імёны – іх узнікненне, развіццё і функцыянаванне ў мове | М.В. Бірыла, І.А. Гапоненка, У.М. Генкін, В.А. Жучкевіч, А.В. Кавалёва, І.Л. Капылоў, В.П. Лемцюгова, Г.М. Мезенка, В.І. Рагаўцоў, Я.Н. Рапановіч, І.Э. Ратнікава, А.Ф. Рогалеў, Г.К. Семянькова, В.В. Шур і інш. |
| Фразеалогія | Фраземны склад мовы, структура фразем, іх суадносіны са словам і словазлучэннем, тыпы фразем у залежнасці ад семантычнай еднасці кампанентаў, паходжанне і ўжыванне ў маўленні | А.С. Аксамітаў, М.М. Аляхновіч, Н.В. Гаўрош, М.А. Даніловіч, Я.Я. Іваноў, І.А. Кісялёў, У.І. Коваль, І.Я. Лепешаў, Г.М. Малажай, В.І. Несцяровіч, Н.М. Нямковіч, Т.І. Тамашэвіч, Т.М. Трыпуціна, Г.Ф. Юрчанка, Ф.М. Янкоўскі і інш. |
| Парэміялогія | Устойлівыя, узнаўляльныя алегарычныя выказванні звычайна павучальнага характару | А.С. Аксамітаў, С.Ф. Іванова, Я.Я. Іваноў, І.Я. Лепешаў, Г.М. Малажай, М.А. Якалцэвіч і інш. |
| Афарыстыка | Устойлівыя выслоўі фальклорнага ці літаратурнага паходжання | Н.В. Гаўрош, Я.Я. Іваноў, А.Я. Леванюк, А.Я. Міхневіч, М.І. Новік, Н.М. Нямковіч, Т.М. Трыпуціна, Ф.М. Янкоўскі і інш. |
| Марфемалогія | Тыпы марфем, іх разнавіднасці, асаблівасці ўзаемаадносін і функцыянавання марфем у слове | Л.А. Антанюк, Г.А. Арцямёнак, А.М. Бардовіч, М.С. Васілеўскі, П.В. Вярхоў, М.М. Круталевіч, В.П. Лемцюгова, А.А. Лукашанец, М.А. Паўленка, М.Р. Прыгодзіч, П.У. Сцяцко, Л.М. Шакун, П.П. Шуба, А.І. Яновіч і інш. |

| Раздзел лінгвістыкі | Аб'ект вывучэння | Даследчыкі |
|---|---|---|
| Дэрыватагогія (словаўтварэнне) | Шляхі і спосабы ўтварэння слоў | М.А. Аўласевіч, У.В. Анічэнка, Г.А. Арцямёнак, З.І. Бадзевіч, А.М. Бардовіч, В.Л. Варановіч, М.С. Васілеўскі, І.У. Кандраценя, М.М. Круталевіч, А.А. Лукашанец, В.А. Ляшчынская, М.Р. Прыгодзіч, П.У. Сцяцко, П.М. Чайкун, М.В. Шабовіч, Л.М. Шакун, П.П. Шуба |
| Марфалогія | Прынцыпы вылучэння і размежавання граматычна-семантычных класаў моў, формы словазмянення, граматычныя катэгорыі, граматычна-семантычныя класы слоў (часціны мовы) | У.В. Анічэнка, Л.А. Антанюк, М.Г. Булахаў, П.В. Вярхоў, М.А. Жыдовіч, І.А. Кісялёў, Ю.Ф. Мацкевіч, А.І. Наркевіч, А.Я. Супрун, Т.Ф. Сцяшковіч, П.П. Шуба і інш. |
| Сінтаксіс | Словазлучэнні і сказы, іх тыпы, значэнні, функцыянальныя асаблівасці, асноўныя адзінкі звязнай мовы, сродкі і віды сінтаксічнай сувязі | М.А. Аўласевіч, Т.П. Бандарэнка, Л.І. Бурак, І.Л. Бурак, Н.В. Гаўрош, К.І. Гурскі, Ц.П. Ломцеў, А.Я. Міхневіч, А.І. Наркевіч, Л.П. Падгайскі, М.С. Яўневіч і інш. |
| Пунктуацыя | Заканамернасці станаўлення і функцыянавання сістэмы знакаў прыпынку ў мове | Л.І. Бурак, І.Л. Бурак, Г.Н. Клюсаў, А.Л. Юрэвіч і інш. |
| Лексікаграфія | Тэорыя і практыка складання слоўнікаў розных тыпаў | М.Я. Байкоў, М.В. Бірыла, М.Ф. Гуліцкі, С.М. Грабчыкаў, А.І. Кісялеўскі, К.К. Крапіва, К.П. Любецкая, С.М. Некрашэвіч, В.М. Нікалаева, Л.В. Рычкова, І.І. Савіцкая, М.Р. Суднік, С.У. Шахоўская, В.К. Шчэрбін і інш. |

## 1.3. Сучасная беларуская літаратурная мова як аб'ект вывучэння

**І.** Прыметнік ***сучасны*** ў беларускай мове мае некалькі значэнняў:

- які мае адносіны да цяперашняга часу, да сваёй эпохі: *У сучаснай беларускай мове шмат службовых слоў для ўстанаўлення сувязей паміж членамі сказа* (М. Цікоцкі); *Раіса іграла мелодыі сучасных песень, а гэта было зразумела і проста* (І. Шамякін);
- які знаходзіцца на ўзроўні свайго веку, адпавядае патрабаванням свайго часу: *Дасягненні сучаснай навукі*; *Сучаснае абсталяванне*; *Сучасныя хуткасці*; *Калхіду асушыць можна, сучасная тэхніка здолее гэта здзейсніць* (Э. Самуйлёнак);

- які адбываецца цяпер, у дадзены час; цяперашні: *Сучаснае жыццё, яно ў нашых руках*! (М. Нікановіч); *Сучаснымі крыніцамі жыўлення азёр з'яўляюцца дажджавыя, снегавыя, рачныя і грунтавыя воды* ("Прырода Беларусі").

Беларуская мова, у сваю чаргу, мае непасрэдныя адносіны да цяперашняга часу, адпавядае яго патрабаванням і выкарыстоўваецца ў грамадстве ў дадзены момант.

Традыцыйна тэрмін ***сучасная*** ў дачыненні да беларускай літаратурнай мовы абазначае ***новую беларускую мову*** (XIX−XXI стст.) у яе сфарміраваным (сучасным) выглядзе – з устойлівай сістэмай лексічных, арфаэпічных, марфалагічных, сінтаксічных, словаўтваральных і стылістычных нормаў.

**II.** Тэрмін ***беларуская*** азначае, што гэта мова беларусаў, асноўнага насельніцтва Рэспублікі Беларусь, дзяржаўная мова нашай краіны.

**III.** Пад тэрмінам ***літаратурная мова*** ў лінгвістыцы разумеюць адну з формаў існавання нацыянальнай мовы – найвышэйшую форму выяўлення нацыянальнай свядомасці і нацыянальнай культуры, што ўспрымаецца носьбітамі мовы як правільная, узорная, унармаваная мова.

**Літаратурная мова** – гістарычна сфарміраваная сістэма агульнаўжывальных моўных элементаў, маўленчых сродкаў, што прайшлі працяглую культурную апрацоўку ў пісьмовых і вусных тэкстах аўтарытэтных майстроў слова, у зносінах носьбітаў нацыянальнай мовы.

У літаратурнай мове сканцэнтраваны такія моўныя сродкі, якія дазваляюць найбольш дакладна, выразна і дыферэнцыравана пазначаць складаны свет ідэй, уяўленняў, пачуццяў яе носьбітаў, усю шматстайнасць прадметаў, паняццяў і з'яў навакольнай рэчаіснасці. Асноўнае прызначэнне літаратурнай мовы – забяспечваць зносіны людзей, што размаўляюць на гэтай мове, ва ўсіх сферах грамадскай дзейнасці.

Варта строга размяжоўваць паняцці *літаратурная мова* і *мова* (*мастацкай*) *літаратуры*:

| Літаратурная мова | Мова (мастацкай) літаратуры |
|---|---|
| разнавіднасць нацыянальнай мовы, найбольш прыдатная для камунікацыі ў большасці сацыяльных сфер (навукі, адукацыі, дыпламатыі, юрыспрудэнцыі), у службовых і паўсядзённых зносінах адукаваных і выхаваных людзей | разнавіднасць літаратурнай мовы, якая базіруецца на літаратурнай мове, аднак шырока выкарыстоўвае элементы іншых формаў нацыянальнай мовы – тэрытарыяльных і сацыяльных дыялектаў, прастамоўя, індывідуальнай словатворчасці пісьменніка і г.д. |

Літаратурная мова – катэгорыя *гістарычная*. Яна фарміруецца на пэўным этапе сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця этнасу, калі ў грамадстве ўзнікае ўсведамленне пра патрэбу ў больш дасканалым, чым

тэрытарыяльныя дыялекты, агульназразумелым сродку зносін ва ўсіх сферах грамадскага жыцця і дзейнасці. Гістарычнасць літаратурнай мовы выяўляецца:

- у паступовай зменлівасці моўных нормаў;
- фарміраванні функцыянальных стыляў мовы, стылістычнай дыферэнцыяцыі сродкаў выражэння, павелічэнні лексічна-фразеалагічнага фонду мовы, фарміраванні тэрміналогіі;
- развіцці пісьменнасці, назапашванні разнажанравых пісьмовых помнікаў (тэкстаў);
- стварэнні заканадаўча-прававых актаў, накіраваных на ахову літаратурнай мовы як агульнанацыянальнай духоўнай каштоўнасці.

Літаратурная мова валодае шэрагам *уласцівасцей*, якія істотна адрозніваюць яе ад іншых формаў нацыянальнай мовы:

- літаратурная мова існуе ў вуснай і пісьмовай формах у адрозненне, напрыклад, ад тэрытарыяльных і сацыяльных дыялектаў, якія прадстаўлены пераважна вуснай формай (хоць на некаторых з іх часам ствараюцца мастацкія творы і друкуюцца перыядычныя выданні);
- літаратурная мова – кадыфікаваная моўная падсістэма, якой уласцівыя адзіныя, абавязковыя для ўсіх носьбітаў больш-менш устойлівыя нормы; моўныя нормы мэтанакіравана ўдасканальваюцца і фіксуюцца ў граматыках і нарматыўных слоўніках;
- літаратурная мова – поліфункцыянальная падсістэма, прыдатная для выкарыстання ў разнастайных сферах чалавечай дзейнасці;
- літаратурная мова – функцыянальна дыферэнцыраваная падсістэма мовы, якая ў залежнасці ад сферы выкарыстання і ўскладзеных на яе функцый падзяляецца на разнавіднасці (кніжную і размоўную) і функцыянальныя стылі (навуковы, афіцыйны, публіцыстычны);
- літаратурная мова – сацыяльна прэстыжная; як адзін з найважнейшых кампанентаў культуры яна ўяўляе сабой такую камунікатыўную разнавіднасць нацыянальнай мовы, на якую арыентуюцца ўсе, хто ёй карыстаецца, незалежна ад ступені валодання моўнымі нормамі;
- літаратурнай мове ўласцівая пэўная варыянтнасць, якая мае стылістычныя і сэнсавыя адценні;
- літаратурная мова характарызуецца стабільнасцю, без чаго было б немагчыма абменьвацца культурнымі каштоўнасцямі паміж пакаленнямі носьбітаў гэтай мовы; стабільнасць забяспечваецца падтрыманнем стылявых традыцый і захаваннем кадыфікаваных нормаў, што рэгулююць існаванне і развіццё мовы.

**IV.** Для вызначэння нацыянальнай спецыфікі літаратурнай мовы прынцыповую ролю маюць сацыяльныя ўмовы яе існавання, або ***моўная сітуацыя***, у якой узнікае, развіваецца і функцыянуе літаратурная мова.

Моўная сітуацыя кардынальна ўплывае на фарміраванне і выкарыстанне ў маўленчай дзейнасці сістэмы стыляў, на актуалізацыю эвалюцыйных змен у галіне лексікі, лексічнай семантыкі, фразеалогіі, словаўтварэння, арфаэпіі, часткова ў сінтаксісе, ідыяматыцы, тыпалогіі тэкстаў і інш.

# ЗМЕСТ

ПРАДМОВА . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 3

**РАЗДЗЕЛ I. БЕЛАРУСКАЯ МОВА ЯК ГРАМАДСКАЯ З'ЯВА І АБ'ЕКТ ВЫВУЧЭННЯ** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 6

1.1. Сучасная беларуская літаратурная мова як вучэбная дысцыпліна . . . . . . 6
1.2. Структура дысцыпліны "Сучасная беларуская літаратурная мова" . . . . . 6
1.3. Сучасная беларуская літаратурная мова як аб'ект вывучэння . . . . . . . . . . 9
1.4. З гісторыі беларускай мовы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 12
1.5. Нормы беларускай літаратурнай мовы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 16
1.6. Беларуская нацыянальная мова . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 18
1.7. Дыялектная аснова беларускай літаратурнай мовы . . . . . . . . . . . . . . . 22
1.8. Функцыянальна-стылявая дыферэнцыяцыя беларускай літаратурнай мовы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 26
1.9. Беларуская мова сярод славянскіх моў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 28

**РАЗДЗЕЛ II. ФАНАЛОГІЯ** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 31

2.1. Фаналогія як раздзел мовазнаўства . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 31
2.2. Фанетыка як раздзел фаналогіі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 32
2.3. Акустычныя асаблівасці гукаў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 33
2.4. Артыкуляцыя. Артыкуляцыйны апарат . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 34
2.5. Артыкуляцыйная класіфікацыя гукаў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 36
2.6. Змены гукаў у маўленчай плыні . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 41
2.7. Чаргаванні гукаў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 44
2.8. Сілабіка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 45
2.9. Акцэнталогія . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 46
2.10. Інтаналогія . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 49
2.11. Фанеміка як раздзел фаналогіі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 50
2.12. Транскрыпцыя . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 53
2.13. Фанетычны аналіз . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 55

**РАЗДЗЕЛ III. АРФАЭПІЯ** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 56

3.1. Арфаэпія як раздзел мовазнаўства . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 56
3.2. Вымаўленне галосных гукаў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 56
3.3. Вымаўленне зычных гукаў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 57

**РАЗДЗЕЛ IV. ГРАФІКА** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 60

4.1. Графіка як раздзел мовазнаўства . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 60
4.2. Беларускі алфавіт. Суадносіны паміж літарамі і гукамі . . . . . . . . . . . . 61
4.3. Прынцыпы беларускай графікі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 65

4.4. З гісторыі беларускай графікі . . . 66
4.5. Графічны аналіз . . . 70

**РАЗДЗЕЛ V. АРФАГРАФІЯ** . . . 71

5.1. Арфаграфія як раздзел мовазнаўства . . . 71
5.2. Прынцыпы беларускай арфаграфіі . . . 72
5.3. Асноўныя правілы беларускай арфаграфіі . . . 76
5.4. З гісторыі беларускай арфаграфіі . . . 85
5.5. Арфаграфічны аналіз . . . 91

**РАЗДЗЕЛ VI. ЛЕКСІКАЛОГІЯ** . . . 92

6.1. Лексікалогія як раздзел мовазнаўства . . . 92
6.2. Слова як адзінка лексічнай сістэмы мовы . . . 93
6.3. Лексічнае і граматычнае значэнні слова . . . 94
6.4. Тыпы лексічных значэнняў слова . . . 96
6.5. Мнагазначнасць слова. Тыпы пераносных значэнняў слова . . . 97
6.6. Аманімія . . . 99
6.7. Паранімія . . . 102
6.8. Сінанімія . . . 104
6.9. Антанімія . . . 106
6.10. Лексіка беларускай мовы паводле паходжання . . . 108
6.11. Лексіка беларускай мовы паводле сферы ўжывання . . . 115
6.12. Стылістычная дыферэнцыяцыя лексікі беларускай літаратурнай мовы . 122
6.13. Актыўная і пасіўная лексіка . . . 127
6.14. Змены ў лексіцы ў канцы XX – пачатку XXI ст. . . . 132
6.15. Лексікалагічны аналіз . . . 134

**РАЗДЗЕЛ VII. АНАМАТАЛОГІЯ** . . . 136

7.1. Анаматалогія як раздзел мовазнаўства . . . 136
7.2. Асноўныя паняцці анаматалогіі . . . 137
7.3. Агульныя і ўласныя імёны . . . 138
7.4. Тыпы онімаў . . . 139
7.5. Анамастычныя ўніверсаліі . . . 144
7.6. Паходжанне і ўтварэнне онімаў . . . 145
7.7. Анаматалагічны аналіз . . . 147

**РАЗДЗЕЛ VIII. ФРАЗЕАЛОГІЯ** . . . 149

8.1. Фразеалогія як раздзел мовазнаўства . . . 149
8.2. Аб’ём і межы фразеалогіі . . . 149
8.3. Фразема як адзінка мовы . . . 149
8.4. Варыянтнасць фразем . . . 150
8.5. Семантычныя з’явы ў фразеалогіі . . . 151

8.6. Семантычная характарыстыка фразем . . . . . . . . . . 153
8.7. Этымалагічная характарыстыка фразем . . . . . . . . . . 154
8.8. Марфалагічная характарыстыка фразем . . . . . . . . . . 155
8.9. Сінтаксічная характарыстыка фразем . . . . . . . . . . 156
8.10. Стылістычная характарыстыка фразем . . . . . . . . . . 158
8.11. Перыфраза . . . . . . . . . . 160
8.12. Фразеалагічны аналіз . . . . . . . . . . 160

**РАЗДЗЕЛ IX. ПАРЭМІЯЛОГІЯ . . . . . . . . . . 162**

9.1. Парэміялогія як раздзел мовазнаўства . . . . . . . . . . 162
9.2. Паняцце прыказкі . . . . . . . . . . 162
9.3. Сэнсавая класіфікацыя прыказак . . . . . . . . . . 163
9.4. Парэміялагічны аналіз . . . . . . . . . . 164

**РАЗДЗЕЛ X. АФАРЫСТЫКА . . . . . . . . . . 165**

10.1. Афарыстыка як раздзел мовазнаўства . . . . . . . . . . 165
10.2. Паняцце афарызма . . . . . . . . . . 165
10.3. Афарызацыя . . . . . . . . . . 166
10.4. Крылатыя словы . . . . . . . . . . 166

**РАЗДЗЕЛ XI. МАРФЕМАЛОГІЯ . . . . . . . . . . 168**

11.1. Марфемалогія як раздзел мовазнаўства . . . . . . . . . . 168
11.2. Асноўныя адзінкі марфемалогіі . . . . . . . . . . 169
11.3. Марфемная структура слова. Тыпы марфем . . . . . . . . . . 170
11.4. Сістэмныя адносіны паміж афіксамі . . . . . . . . . . 177
11.5. Змены ў марфемнай структуры слова . . . . . . . . . . 179
11.6. Марфемалагічны аналіз . . . . . . . . . . 180

**РАЗДЗЕЛ XII. ДЭРЫВАТАЛОГІЯ (СЛОВАЎТВАРЭННЕ) . . . . . . . . . . 182**

12.1. Дэрываталогія як раздзел мовазнаўства . . . . . . . . . . 182
12.2. Асноўныя паняцці і адзінкі дэрываталогіі . . . . . . . . . . 183
12.3. Спосабы словаўтварэння . . . . . . . . . . 188
12.4. Дэрываталагічны аналіз . . . . . . . . . . 197

**РАЗДЗЕЛ XIII. МАРФАЛОГІЯ . . . . . . . . . . 199**

**Тэма 1. Марфалогія як раздзел граматыкі . . . . . . . . . . 199**

13.1.1. Агульная характарыстыка марфалогіі . . . . . . . . . . 199
13.1.2. Асноўныя граматычныя паняцці і адзінкі . . . . . . . . . . 199
13.1.3. Граматычна-семантычныя класы слоў (часціны мовы) . . . . . . . . . . 201

13.1.4. Дыскусійныя пытанні класіфікацыі часцін мовы . . . . . . . . . . . . . . . . 202
13.1.5. Сістэма часцін мовы ў беларускай лінгвістыцы . . . . . . . . . . . . . . . . 205

**Тэма 2. Назоўнік** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 206

13.2.1. Агульная характарыстыка назоўніка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 206
13.2.2. Тыпы назоўнікаў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 207
13.2.3. Граматычныя катэгорыі назоўніка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 211
13.2.4. Катэгорыя роду . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 211
13.2.5. Катэгорыя ліку . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 214
13.2.6. Катэгорыя склону . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 216
13.2.7. Сістэма скланення назоўнікаў у сучаснай беларускай мове . . . . . . . . . 219
13.2.8. Скланенне асабовых імён і прозвішчаў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 227
13.2.9. Скланенне геаграфічных назваў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 233
13.2.10. Формы назоўнікаў з суфіксамі суб'ектыўнай ацэнкі . . . . . . . . . . . . 235
13.2.11. Словаўтварэнне назоўнікаў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 235
13.2.12. Марфалагічны аналіз назоўніка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 239

**Тэма 3. Прыметнік** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 240

13.3.1. Агульная характарыстыка прыметніка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 240
13.3.2. Тыпы прыметнікаў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 240
13.3.3. Фармальныя асаблівасці прыметнікаў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 243
13.3.4. Ступені параўнання якасных прыметнікаў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 245
13.3.5. Формы прыметнікаў са значэннем суб'ектыўнай ацэнкі і меры якасці 247
13.3.6. Скланенне прыметнікаў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 248
13.3.7. Словаўтварэнне прыметнікаў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 250
13.3.8. Марфалагічны аналіз прыметніка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 251

**Тэма 4. Лічэбнік** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 252

13.4.1. Агульная характарыстыка лічэбніка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 252
13.4.2. Тыпы лічэбнікаў паводле значэння . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 254
13.4.3. Тыпы лічэбнікаў паводле структуры . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 257
13.4.4. Скланенне лічэбнікаў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 258
13.4.5. Асаблівасці сінтаксічнай сувязі лічэбнікаў з назоўнікамі . . . . . . . . . . 264
13.4.6. Няпэўна-колькасныя словы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 265
13.4.7. Марфалагічны аналіз лічэбніка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 265

**Тэма 5. Займеннік** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 266

13.5.1. Займеннік як часціна мовы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 266
13.5.2. Тыпы займеннікаў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 268
13.5.3. Скланенне займеннікаў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 271
13.5.4. Словаўтварэнне займеннікаў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 280
13.5.5. Марфалагічны аналіз займенніка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 280

**Тэма 6. Дзеяслоў** . . . . . . . . . . 281

13.6.1. Агульная характарыстыка дзеяслова . . . . . . . . . . 281
13.6.2. Інфінітыў . . . . . . . . . . 282
13.6.3. Асновы дзеяслова . . . . . . . . . . 282
13.6.4. Пераходныя і непераходныя дзеясловы . . . . . . . . . . 283
13.6.5. Зваротныя дзеясловы . . . . . . . . . . 284
13.6.6. Катэгорыя стану дзеяслова . . . . . . . . . . 285
13.6.7. Катэгорыя трывання дзеяслова . . . . . . . . . . 286
13.6.8. Прэдыкатыўныя катэгорыі дзеяслова . . . . . . . . . . 288
13.6.9. Спражэнне дзеясловаў . . . . . . . . . . 293
13.6.10. Класы дзеясловаў . . . . . . . . . . 295
13.6.11. Словаўтварэнне дзеясловаў . . . . . . . . . . 296
13.6.12. Марфалагічны аналіз дзеяслова . . . . . . . . . . 297

**Тэма 7. Дзеепрыметнік як форма дзеяслова** . . . . . . . . . . 298

13.7.1. Агульная характарыстыка дзеепрыметніка як формы дзеяслова . . . . . 298
13.7.2. Утварэнне дзеепрыметнікаў . . . . . . . . . . 299
13.7.3. Ужыванне дзеепрыметнікаў . . . . . . . . . . 300
13.7.4. Пераход дзеепрыметнікаў у прыметнікі . . . . . . . . . . 300
13.7.5. Марфалагічны аналіз дзеепрыметніка . . . . . . . . . . 301

**Тэма 8. Дзеепрыслоўе як форма дзеяслова** . . . . . . . . . . 301

13.8.1. Агульная характарыстыка дзеепрыслоўя як формы дзеяслова . . . . . . 301
13.8.2. Утварэнне дзеепрыслоўяў . . . . . . . . . . 303
13.8.3. Ужыванне дзеепрыслоўяў . . . . . . . . . . 303
13.8.4. Пераход дзеепрыслоўяў у прыслоўі . . . . . . . . . . 304
13.8.5. Марфалагічны аналіз дзеепрыслоўя . . . . . . . . . . 304

**Тэма 9. Прыслоўе** . . . . . . . . . . 304

13.9.1. Прыслоўе як часціна мовы . . . . . . . . . . 304
13.9.2. Тыпы прыслоўяў паводле значэння . . . . . . . . . . 306
13.9.3. Ступені параўнання прыслоўяў . . . . . . . . . . 307
13.9.4. Формы суб’ектыўнай ацэнкі і меры якасці . . . . . . . . . . 308
13.9.5. Утварэнне прыслоўяў . . . . . . . . . . 309
13.9.6. Пераход слоў іншых часцін мовы ў прыслоўі . . . . . . . . . . 312
13.9.7. Прыслоўі ў ролі іншых часцін мовы . . . . . . . . . . 312
13.9.8. Марфалагічны аналіз прыслоўя . . . . . . . . . . 313

**Тэма 10. Безасабова-прэдыкатыўныя словы (словы катэгорыі стану)** . . . 314

13.10.1. Агульная характарыстыка безасабова-прэдыкатыўных слоў . . . . . . 314
13.10.2. Тыпы безасабова-прэдыкатыўных слоў паводле значэння . . . . . . . . 314
13.10.3. Граматычныя асаблівасці безасабова-прэдыкатыўных слоў . . . . . . . . 315

13.10.4. Суаднесенасць безасабова-прэдыкатыўных слоў з іншымі часцінамі мовы . . . 315
13.10.5. Марфалагічны аналіз безасабова-прэдыкатыўных слоў . . . 316

**Тэма 11. Прыназоўнік** . . . 317

13.11.1. Агульная характарыстыка прыназоўніка . . . 317
13.11.2. Тыпы прыназоўнікаў паводле паходжання . . . 319
13.11.3. Структурныя тыпы прыназоўнікаў . . . 321
13.11.4. Выкарыстанне прыназоўнікаў з рознымі склонамі . . . 321
13.11.5. Асаблівасці ўжывання прыназоўнікаў у беларускай мове . . . 322
13.11.6. Сінаніміка прыназоўнікавых канструкцый . . . 323
13.11.7. Марфалагічны аналіз прыназоўніка . . . 324

**Тэма 12. Злучнік** . . . 325

13.12.1. Агульная характарыстыка злучніка . . . 325
13.12.2. Тыпы злучнікаў . . . 325
13.12.3. Злучальныя злучнікі . . . 326
13.12.4. Падпарадкавальныя злучнікі . . . 327
13.12.5. Адрозненне злучнікаў ад слоў іншых часцін мовы . . . 328
13.12.6. Марфалагічны аналіз злучніка . . . 330

**Тэма 13. Часціца** . . . 330

13.13.1. Агульная характарыстыка часціцы . . . 330
13.13.2. Тыпы часціц . . . 331
13.13.3. Сэнсавыя часціцы . . . 332
13.13.4. Мадальныя і мадальна-валявыя часціцы . . . 333
13.13.5. Эмацыянальна-экспрэсіўныя часціцы . . . 334
13.13.6. Формаўтваральныя часціцы . . . 334
13.13.7. Выкарыстанне часціц у словаўтварэнні . . . 335
13.13.8. Марфалагічны аналіз часціцы . . . 335

**Тэма 14. Мадальныя словы** . . . 336

13.14.1. Агульнае паняцце пра мадальнасць . . . 336
13.14.2. Мадальныя словы як часціна мовы . . . 337
13.14.3. Пытанне аб мадальных словах у лінгвістычнай літаратуры . . . 338
13.14.4. Тыпы мадальных слоў . . . 339
13.14.5. Суадноснасць мадальных слоў са словамі іншых часцін мовы . . . 339
13.14.6. Марфалагічны аналіз мадальных слоў . . . 340

**Тэма 15. Выклічнік. Гукапераймальныя словы** . . . 341

13.15.1. Агульная характарыстыка выклічніка . . . 341
13.15.2. Тыпы выклічнікаў . . . 342
13.15.3. Агульная характарыстыка гукапераймальных слоў . . . 343

13.15.4. Тыпы гукапераймальных слоў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 343
13.15.5. Адрозненне гукапераймальных слоў ад выклічнікаў . . . . . . . . . . . . 344
13.15.6. Марфалагічны аналіз выклічнікаў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 344

**РАЗДЗЕЛ XIV. СІНТАКСІС** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 345

**Тэма 1. Сінтаксіс як раздзел граматыкі** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 345

14.1.1. Агульная характарыстыка сінтаксісу . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 345
14.1.2. Асноўныя аб’екты вывучэння сінтаксісу . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 346
14.1.3. Сінтаксічныя адзінкі, сінтаксічныя паняцці . . . . . . . . . . . . . . . . . . 346
14.1.4. Сродкі выражэння сінтаксічнай сувязі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 347
14.1.5. Асноўныя аспекты апісання сінтаксісу . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 347

**Тэма 2. Словазлучэнне** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 348

14.2.1. Словазлучэнне як сінтаксічная адзінка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 348
14.2.2. Адрозненне словазлучэння ад слова і сказа . . . . . . . . . . . . . . . . . . 348
14.2.3. Класіфікацыя словазлучэнняў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 349
14.2.4. Структурная схема словазлучэння . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 352
14.2.5. Пытанні аб тыпах словазлучэнняў у лінгвістычнай літаратуры . . . . . . 353
14.2.6. Віды сувязі слоў у словазлучэнні . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 353
14.2.7. Сродкі выражэння сувязі слоў у словазлучэнні . . . . . . . . . . . . . . . . 355
14.2.8. Асаблівасці кіравання ў беларускай мове . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 355
14.2.9. Сінтаксічны аналіз словазлучэння . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 356

**Тэма 3. Просты сказ** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 357

14.3.1. Сказ як сінтаксічная адзінка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 357
14.3.2. Структура двухсастаўнага сказа . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 361
14.3.3. Галоўныя члены сказа . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 364
14.3.4. Даданыя члены сказа . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 372
14.3.5. Аднасастаўныя сказы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 383
14.3.6. Няпоўныя сказы. Словы-сказы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 390
14.3.7. Камунікацыйная арганізацыя сказа . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 395
14.3.8. Сказы з параўнальнымі канструкцыямі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 399
14.3.9. Сказы з аднароднымі членамі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 404
14.3.10. Сказы з адасобленымі членамі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 409
14.3.11. Пабочныя канструкцыі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 414
14.3.12. Устаўныя канструкцыі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 420
14.3.13. Зваротак . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 423
14.3.14. Сінтаксічны аналіз простага сказа . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 427

**Тэма 4. Складаны сказ** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 428

14.4.1. Агульная характарыстыка складанага сказа . . . . . . . . . . . . . . . . . . 428
14.4.2. Тыпы складаных сказаў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 430

14.4.3. Складаназлучаны сказ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 434
14.4.4. Тыпы складаназлучаных сказаў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 436
14.4.5. Складаназалежны сказ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 443
14.4.6. Тыпы складаназалежных сказаў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 446
14.4.7. Складаназалежны сказ з некалькімі даданымі часткамі . . . . . . . . . . . 462
14.4.8. Бяззлучнікавы складаны сказ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 469
14.4.9. Тыпы бяззлучнікавых складаных сказаў . . . . . . . . . . . . . . . . . . 472
14.4.10. Складаны сказ з рознымі відамі сувязі (камбінаваны складаны сказ) 481
14.4.11. Тыпы складаных сказаў з рознымі відамі сувязі . . . . . . . . . . . . . 482
14.4.12. Сінтаксічны аналіз складанага сказа . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 484

**Тэма 5. Асноўныя адзінкі і формы арганізацыі звязнай мовы** . . . . . . . . . 487

14.5.1. Тэкст як аб’ект сінтаксісу . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 487
14.5.2. Функцыянальна-сэнсавыя тыпы тэксту . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 490
14.5.3. Перыяд . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 494
14.5.4. Складанае сінтаксічнае цэлае . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 495
14.5.5. Абзац . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 499

**Тэма 6. Чужая мова** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 501

14.6.1. Спосабы перадачы чужаслоўя ў беларускай мове . . . . . . . . . . . . . 501
14.6.2. Простая мова . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 501
14.6.3. Ускосная мова . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 504
14.6.4. Няўласна-простая мова . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 505

**РАЗДЗЕЛ XV. ПУНКТУАЦЫЯ** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 507

15.1. Пунктуацыя як сістэма знакаў прыпынку . . . . . . . . . . . . . . . . . . 507
15.2. З гісторыі пунктуацыі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 508
15.3. Сучасныя пунктуацыйныя знакі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 510
15.4. Выкарыстанне знакаў прыпынку . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 510
15.5. Пунктуацыйны аналіз . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 513

**РАЗДЗЕЛ XVI. ЛЕКСІКАГРАФІЯ** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 516

16.1. Лексікаграфія як раздзел мовазнаўства . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 516
16.2. Слоўнік як асноўная адзінка лексікаграфіі . . . . . . . . . . . . . . . . . 517
16.3. З гісторыі беларускай лексікаграфіі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 519
16.4. Структура слоўніка і яе кампаненты . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 539
16.5. Тыпы слоўнікаў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 543
16.6. Лексікаграфічны аналіз . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 579

ЛІТАРАТУРА . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 581

Вучэбнае выданне

**Дзятко** Дзмітрый Васільевіч
**Лобань** Наталля Пятроўна
**Мароз** Святлана Сяргееўна і інш.

**СУЧАСНАЯ БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРНАЯ МОВА**

Падручнік

Рэдактар *Л.М. Макейчык*
Мастацкія рэдактары *В.А. Ярашэвіч*, *С.Д. Чыркоў*
Камп'ютарная вёрстка *В.А. Самсонавай*, *А.М. Бабянковай*,
*Ю.М. Трусевіч*, *Н.В. Шабуні*
Карэктары *Т.К. Хваль*, *А.І. Галдзянкова*, *Л.М. Макейчык*

Падпісана да друку 05.02.2024. Фармат 60×90/16. Папера афсетная. Гарнітура «Times New Roman».
Афсетны друк. Ум. друк. арк. 37,0. Ул.-выд. арк. 38,85. Тыраж 300 экз. Заказ 29.

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецтва "Вышэйшая школа"».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка
друкаваных выданняў № 1/3 ад 08.07.2013.
Пр. Пераможцаў, 11, 220004, Мінск.
e-mail: market@vshph.com http://vshph.com

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецкі цэнтр Беларускага
дзяржаўнага ўніверсітэта». Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/63 ад 19.03.2014.
Вул. Чырвонаармейская, 6, 220030, Мінск.